*Шмелева Т. В.* Техника сложного предложения // Лингвистические идеи В. А. Белошапковой и их воплощение в современной русистике. Тюмень : Мандр и К[а], 2010. С. 116–133.

# РОЛЯ ГІПОТЭЗЫ Ў НАВУКОВЫМ ДАСЛЕДАВАННІ (ПАМЯЦІ А.Я. МІХНЕВІЧА)

***Н.Ю. Паўлоўская***

*Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт,*
*вул. Захарава, 21, 220034, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*info@mslu.by*

Арнольд Яфімавіч Міхневіч з’яўляецца не толькі цудоўным чалавекам, выдатным педагогам і аратарам. Таленавіты мовазнаўца, даследчык з бязмежным лінгвістычным кругаглядам, эрудыцыяй, Арнольд Яфімавіч застанецца ў памяці яго вучняў аўтарытэтным вучоным, тонкім псіхолагам, які заахвочваў на пошукі новых ідэй, ухваляў самастойнасць, ініцыятыўнасць, незалежнасць навуковых поглядаў. На прыкладзе толькі аднаго праекта – граматычнай тэорыі мадальнасці – добра відаць, што Арнольд Яфімавіч быў унікальным даследчыкам, генератарам новых ідэй, рэалізацыя якіх, па сутнасці, стварыла беларускую нацыянальную лінгвістычную школу высокага ўзроўню і патэнцыялу.

***Ключавыя словы:*** Арнольд Яфімавіч Міхневіч; навуковае даследаванне; праблема і гіпотэза; гіпатэтычныя веды; канцэпцыя мадальнасці; канцэптуалізацыя і катэгарызацыя; узроўні значэння ў адзінках мадальнасці; кагнітыўна-дыскурсіўная канцэпцыя мадальнасці; мадальная суперструктура; камунікатыўная стратэгія; мадальная тактыка; характарыстыка дыскурсу.

Навуковае даследаванне ў якасці найбольш развітай формы тэарэтычных ведаў на першым этапе вызначаецца двума асноўнымі структурна-змястоўнымі кампанентамі – праблемай і гіпотэзай. Калі праблема – гэта асэнсаванне супярэчнасцей паміж фактамі і старымі спосабамі іх тлумачэння, гіпотэза – форма нявызначаных ведаў, якая змяшчае думку, здагадку, што мае патрэбнасць у доказе. Гіпатэтычныя веды носяць імавернасный характар і патрабуюць абгрунтавання, праверкі. У ходзе даследавання адны з іх становяцца тэорыяй, іншыя – відазмяняюцца, удакладняюцца ці адкідаюцца і пераходзяць у вобласць зманаў. На ўзроўні дысертацыйных прац гіпотэзы побач з тэмамі часцей за ўсё прапаноўваюцца навуковым кіраўніком ці кансультантам. Для паспяховай навуковай кар’еры матываваныя маладыя спецыялісты шукаюць аўтарытэтных, маштабных, багатых навуковымі ідэямі настаўнікаў і арганізатараў, старшых сяброў, якія могуць прапанаваць грунтоўную, сучасную, перспектыўную тэму даследавання.

Мне вельмі пашчасціла: на сваім навуковым і жыццёвым шляху я сустрэла Арнольда Яфімавіча Міхневіча – геніяльнага мовазнаўца з

бязмежным лінгвістычным кругаглядам і эрудыцыяй, цудоўнага чалавека, выдатнага педагога і аратара. У кожным сваім вучні гэты вялікі вучоны адшукваў індывідуальныя крэатыўныя здольнасці для арыгінальнага вырашэння даследчыцкіх задач, накіроўваў працу ў патрэбнае рэчышча, робячы прапановы і заўвагі не дакучліва, далікатна, але настойліва і абгрунтавана. За гады супрацоўніцтва Арнольд Яфімавіч ніколі не ціснуў сваім аўтарытэтам на сваіх падапечных, наадварот заахвочваў і ўхваляў самастойнасць, ініцыятыяўнасць, незалежнасць навуковых поглядаў, заснаваных у першую чаргу на трывалым навуковым фундаменце даследаванняў папярэднікаў.

Разважанні, меркаванні, ідэі А.Я. Михневіча, выказаныя ў манаграфіях, шматлікіх артыкулах, падручніках, дапаможніках, дакладах на канферэнцыях, у прыватных размовах, з'явіліся пунктам адліку многіх даследаванняў яго вучняў і паслядоўнікаў.

Так, асновай граматычнай тэорыі мадальнасці, распрацаванай намі на фактычным матэрыяле беларускай мовы, паслужыла думка Арнольда Яфімавіча аб мадальных значэннях двух тыпаў, якія грунтуюцца на ідэях верагоднасці і імператыўнасці. З гэтай гіпотэзы была сфарміравана канцэпцыя мадальнасці, якая пашыраецца, дапаўняецца новымі фактамі ў сувязі са станаўленнем кагнітыўна-дыскурсіўнай парадыгмы навуковых ведаў.

Мадальнасць – адна з цэнтральных ацэначных катэгорый мыслення и мовы, якая суадносіць выказванне і рэчаіснасць з пункту погляду моўцы ў адпаведнасці з паўнатой ведаў пра аб'ект, ступенню задаволенасці яго патрэб, жаданняў, імкненняў, інтарэсаў, мэтаў.

Паняцці верагоднасці і імператыўнасці мы звязалі з працэсамі катэгарызацыі і канцэптуалізацыі мадальных з'яў. Моўныя катэгорыі, выступаючы асновай ведаў чалавека пра свет, маюць кагнітыўную аснову ў тым сэнсе, што іх утварэнне – катэгарызацыя – адносіць аб'ект да пэўнага класа і праяўляе найбольш істотныя яго прыметы. Канцэптуалізацыя – утварэнне канцэптаў – спараджаючы новыя сэнсы, таксама разглядаецца як працэс структурацыі ведаў. Аднак, з'яўляючыся класіфікацыйнай дзейнасцю, катэгарызацыя і канцэптуалізацыя адрозніваюцца паводле сваёй мэты: калі першая вылучае «мінімальныя адзінкі чалавечага вопыту ў іх ідэальнай зместавай падачы», другая «аб'ядноўвае моўныя адзінкі, якія маюць падабенства ці характарызуюцца як тоесныя, у буйныя разрады» [3, с. 93].

Мадальнасць, безумоўна, належыць да ўніверсальных, базавых кагнітыўна-дыскурсіўных феноменаў, уласцівых розным мовам. Само яе існаванне з'ўляецца фактам аб'ектыўным. Агульны змест мадальнасці залежыць не толькі ад канкрэтнай мовы, а вызначаецца кагнітыўнай і прагматычнай дзейнасцю чалавека. Гэта дае падставы адрозніваць

семантычны, канцэптуальны, камунікатыўна-прагматычны ўзроўні значэння ў адзінках мадальнасці.

Сучасны погляд на мадальнасць – яе разгляд у рэчышчы кагнітыўна-дыскурсіўнай парадыгмы навуковых ведаў, якая характырызуецца міждысцыплiннасцю, узрастаннем ролі суб'екта і яго цэннасных адносін да прадмета даследавання, мульціпарадыгмальнасцю – прызнаннем «адначасовага руху ў розных накірунках да розных ісцін, ніводная з якіх не лепш і не горш за іншую» [2, с. 16].

Прынцып інтэгратыўнасці як сінтэз ведаў, набытых у розных вобласцях, павінен улічвацца пры кадыфікацыі мадальнасці, паколькі гэты біяпсіхалагічны, семіятычны, кагнітыўны, сацыяльны феномен абумоўлівае наяўнасць ў яе асноўных рэпрэзентантах – словах, словазлучэннях, выказваннях, дыскурсах – сінергетычных ведаў, што выходзяць за межы моўнага кантынууму.

Кагнітыўна-дыскурсіўная канцэпцыя мадальнасці рэалізуецца параметрамі і правіламі, што ахопліваюць разнавіднасці мадальных значэнняў, выкарыстаных у розных тыпах дыскурсу. Усе адлюстраваныя падзеі адрасат успрымае мадальна асэнсаванымі, а сістэма гэтых параметраў і правілаў фарміруецца паняццямі макраструктуры, суперструктуры, макрапрапазіцыі, прапанаванымі Т.А. ван Дэйкам [1, с. 41–67]. Макраструктурай мадальнасці варта лічыць маўленча-разумовую здольнасць суб'екта ўвасабляць рэчаіснасць у прапазіцыю моўных адзінак.

Мадальнымі суперструктурамі з'яўляюцца кагнітыўныя мадэлі, схемы, што ахопліваюць усю сістэму моўных сродкаў і якія даюць магчымасць сканцэнтраваць увагу толькі на неабходных для вывучэння ўласцівасцях аб'екта. Дыскурс і факты ў ім прафілююцца ў адносінах да індывідуальных нормаў і цэннасцей камунікантаў. Згодна з гэтым мадальнасць ідэнтыфікуе аднесенасць адзінак дыскурсу да таго ці іншага магчымага свету, што маецца ў распараджэнні ўдзельнікаў камунікацыі і рэалізуецца з дапамогай дыхатамічных кагнітыўных параметраў рэальнасці/патэнцыяльнасці, дэскрыптыўнасці/крэатыўнасці, верагоднасці/валітыўнасці. Мадальна аформленыя выказванні рэпрэзентуюць, такім чынам, паслядоўнасць дзеянняў, што адлюстроўваюць пераход ад зыходнага магчымага свету да пажаданага. Прыведзеныя кагнітыўныя велічыні і іх камбінаторыка дазваляюць рэпрэзентаваць суперструктуру мадальнасці ў выглядзе макраполя імавернасці з палямі праблематычнай, простай, катэгарычнай верагоднасці, магчымасці (*рэальнасць/патэнцыяльнасць, дэскрыптыўнасць, верагоднасць*) і макраполя волевыяўлення з палямі аптатыўнасці, імператыўнасці, неабходнасці (*патэнцыяльнасць, крэатыўнасць, валітыўнасць*). Задаючы агульную форму, суперструктуры мадальнасці і яе віды арганізуюцца макрапрапазіцыямі, якія выводзяцца з мноства падобных з'яў, канструююцца на аснове значэнняў і акцэнтуюць мадальны аб'ём інфармацыі.

У якасці кагнітыўна-дыскурсіўнай катэгорыі, што выходзіць за межы лексічнай і граматычнай семантыкі, мадальнасць, рэалізуе камунікатыўныя стратэгіі, тактыкі, прыёмы, з дапамогай якіх выяўляюцца веды, думкі, устаноўкі, інтарэсы, мэты карыстальнікаў мовы, спосабы і шляхі разумення адрасатам аўтарскіх інтэнцый. Калі стратэгіі ўвасабляюць «глабальныя намеры аўтара» (паводле Т.А. ван Дэйка), выбраныя ім правілы прымянення моўных адзінак для рэпрэзентацыі канкрэтных камунікатыўных мэтаў, то тактыкі – гэта сукупнасць прыёмаў і сродкаў для дасягнення гэтых мэтаў.

Агульнымі мадальнымі стратэгіямі выступаюць дзве: 1) інфармаванне моўцы аб з'явах рэчаіснасці ці змесце выказвання ў адпаведнасці са ступенню паўнаты яго ведаў аб гэтых падзеях; 2) адрасаванае ці неадрасаванае ўздзеянне моўцы на атрымальніка інфармацыі для выканання/невыканання ім дзеяння.

Мадальныя тактыкі ў якасці комплексу моўных і маўленчых прыёмаў пабудовы дыскурсу (Г.А. Золатава) і камунікатыўных хадоў як маўленчых дзеянняў (В.С. Іссерс) выяўляюцца ў кожным канкрэтным выпадку згодна з аўтарскімі стратэгіямі і інтэнцыямі. Прыкладамі мадальных тактык могуць быць наступныя: перакананне, парада, забарона, пагроза, прыцягненне ўвагі, абарона сваёй пазіцыі ў выглядзе прабачэння, апраўдання, тлумачэння, эксплікацыя нормаў, навязванне поглядаў і жаданняў, самапрэзентацыя, удакладненне, каментаванне, проціпастаўленне, засцярога, папрок, маскіроўка, адхіленне ад тэмы, змягчэнне, вылучэнне, устанаўленне кантакту і інш. (Т.А. ван Дэйк, В.С. Іссерс, А.В. Ільіна, Т.В. Раманава і інш.). Мадальныя макраструктура, суперструктуры, макрапрапазіцыі, стратэгіі, тактыкі з'яўляюцца кагнітыўна-дыскурсіўнымі характарыстыкамі любога дыскурсу, неабходны для эфектыўнай эксплікацыі пазіцыі моўцы, для рэалізацыі прадстаўленняў слухача, а таксама выступаюць крытэрыямі пры кадыфікацыі гэтай катэгорыі.

Так, у афарыстычных радках Р. Барадуліна *А ўсё ж цікава: Ад часу ўцякаем мы Ці час ад нас уцякае?* адначасова рэалізаваны стратэгіі інфармавання аб хуткай хадзе часу і ўздзеяння на адрасата, каб ён не марнаваў сваё жыццё дарэмна. У гэтым рытарычным пытанні-роздуме засведчаны мадальныя тактыкі запрашэння да разважання аб непатрэбнай чалавеку мітусні, і імпліцытнага жадання аўтара звярнуць увагу чытача на каштоўнасць кожнага імгнення, рэалізаваныя ў прыёмы прыцягнення ўвагі, няпэўнасці, папярэджвання.

Гэта ўдача і вялікае шчасце, калі адносіны навуковага кіраўніка і саіскальніка складваюцца як творчае ўзаемадзеянне, калі адбываецца не толькі перадача навуковага вопыту, даследчыцкіх навыкаў, але і ўстанаўліваецца высокая планка інтэлектуальнага ўзроўню і адказнасці вучонага, якая для паслядоўнікаў становіцца найважнейшым арыенцірам у складанай сістэме жыццёвых каардынат.

Аўтарытэтны вучоны, найдасканалейшы мастак вуснага жанру, лекцыйнага маналога, філалагічнай размовы, глыбокі, тонкі і дасціпны суразмоўца і дарадчык, доктар філалагічных Арнольд Яфімавіч Міхневіч – прыклад высокага служэння навуцы і адукацыі. Больш за 500 яго навуковых прац, сярод якіх слоўнікі, энцыклапедыі, хрэстаматыі, дапаможнікі, артыкулы – гэта інтэлектуальны і навуковы ўзор мульціпарадыгмальнага, энцыклапедычнага бачання свету для яго вучняў, паслядоўнікаў, нашчадкаў.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Дейк Т. А. ван.* Язык. Познание. Коммуникация : сборник работ / составление В. В. Петрова ; пер. с англ. яз.; под ред. В. И. Герасимова ; вступ. ст. Ю. Н. Караулова, В. В. Петрова. Москва : Прогресс, 1989. 310 с.
2. *Залевская А.А.* Проблема знания в различных ракурсах // Studia linguistica cognitiva. Вып. 2 : Наука о языке в изменяющейся парадигме знания. Иркутск : БГУЭП, 2009. С.14–64.
3. Краткий словарь когнитивных терминов / под общ. ред. Е. С. Кубряковой. М., 1996. 245 с.


# АРНОЛЬД ЕФИМОВИЧ МИХНЕВИЧ: СЕКРЕТЫ РИТОРИЧЕСКОГО ОБАЯНИЯ


***Т.В. Игнатович***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. К. Маркса, 31, 220030, г. Минск, Республика Беларусь,*
*tavlig@mail.ru*



Рассматривается вклад А.Е. Михневича в развитие лекторского мастерства в советскую эпоху и риторики в постсоветское время, характеризуются научные исследования ученого в этой области, описываются созданные им учебные пособия. Речевая практика А.Е. Михневича подтверждает его методические рекомендации. Цель исследования – дать краткий обзор научной и педагогической деятельности ученого в области ораторского искусства.



***Ключевые слова***: риторика; лекторское мастерство; публичное выступление; учебные пособия; речевое творчество.


*Если одним словом можно сделать счастливым человека, какой нужно быть скотиной, чтобы этого не сказать!* (Р. Роллан)

*Вечна тваім застанецца толькі тое, што ты аддаў* (У. Караткевіч)

Риторическое мастерство ценилось во все времена как способ презентации личности, даже в ситуациях приоритета коллективных форм деятельности.